Анжэліка Прадзеіна

прарэктар па навукова-метадычнай рабоце ДУА «Інстытут культуры Беларусі», кандыдат педагагічных навук (г. Мінск, Беларусь)

# Публічная бібліятэка ў сістэме бесперапыннай адукацыі: тэарэтычны аспект

Сучаснае грамадства інфармацыі і ведаў прад'яўляе высокія патрабаванні да адукаванасці грамадзян, што прадугледжвае адукацыю на працягу ўсяго жыцця.

Аналіз нарматыўных прававых дакументаў, навуковай, навукова-вытворчай, даведачнай літаратуры даў магчымасць прыйсці да высновы, што існуюць розныя падыходы да вызначэння паняцця «бесперапынная адукацыя». У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (далей — Кодэкс) даны тэрмін не знайшоў адлюстравання, але ў дакуменце пазначана, што «единство и непрерывность основного образования обеспечиваются преемственностью его уровней и согласованностью содержания образовательных программ основного образования» [4]. У сучаснай псіхолага-педагагічнай літаратуры адукацыя трактуецца як «процесс, направленый на расширение возможностей компетентностного выбора личностью жизненного пути и на саморазвитие личности» [11, *379*]. У даным кантэксце, як мяркуе Я. С. Рапацэвіч, «непрерывное образование — стадийный и целостный в своих элементах пожизненный процесс, обеспечивающий поступательное развитие творческого потенциала личности и всестороннее обогащение ее духовного мира; целенаправленная систематическая познавательная деятельность по освоению и совершенствованию знаний, умений и навыков, получаемых в общих и специальных учебно-воспитательных учреждениях, а также путем самообразования» [11, *364*]. Таксама аўтар, разглядаючы сістэму бесперапыннай адукацыі, выдзяляе «…научно-познавательные и др. любительские общества и объединения по интересам и т.д., обеспечивающие профессиональный рост, содействующие овладению новыми профессиями, созданию условий для самообразования». Магчыма выказаць думку, што менавіта бібліятэкі сярод устаноў таксама ствараюць умовы для самаадукацыі. Але ў педагагічнай літаратуры бібліятэкі як установы адукацыі амаль не разглядаюцца. Дзейнасць бібліятэк у галіне бесперапыннай адукацыі, на жаль, у нарматыўных прававых дакументах у галіне адукацыі таксама не знайшла адлюстравання. Адпаведна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кодэксу, бібліятэкі, на наш погляд, можна лічыць кампанентам сістэмы адукацыі, які забяспечвае «проведение практических занятий, прохождение практики или производственного обучения обучающимися» [4, *11*].

Такім чынам, аналіз вышэйназваных дакументаў сведчыць, што бібліятэка не з’яўляецца адукацыйнай установай і не ўваходзіць у пералік устаноў, якія абавязаны мець ліцэнзію ў данай галіне і разглядаць бібліятэку як юрыдычную установу з юрыдычнага пункту гледжання няслушна. У той жа час у нарматыўных прававых дакуметах у галіне бібліятэчнай справы, прафесійнай літаратуры перад бібліятэкамі ставяцца задачы, разглядаюцца функцыі ў сферы адукацыі. Так, па меркаванню М. Я. Дворкінай, адукацыйныя магчымасці бібліятэчнага асяроддзя забяспечаны яе інфармацыйным патэнцыялам і грунтоўнымі ведамі [2, *21*].

Згодна з Маніфестам публічных бібліятэк ЮНЕСКА, сярод асноўных задач іх дзейнасці — распаўсюджанне пісьменнасці, адукацыі. Гэтыя задачы павінны быць рэалізаваны ў наступных кірунках дзейнасці бібліятэкі: фарміраванне і развіццё навыкаў чытання ў дзяцей, пачынаючы з ранняга ўзросту, аказанне падтрымкі індывідуальнай, самастойнай адукацыі, а таксама фармальнай адукацыі на ўсіх ступенях, садзейнічанне развіццю інфармацыі і навыкаў камп’ютарнай граматнасці, аказанне падтрымкі дзейнасці і праграм па распаўсюджванню пісьменнасці, роўна як і ўдзелам у іх усіх узроставых груп, і разгортванню, у выпадку неабходнасці, такой дзейнасці [6].

Вызначаны задачы публічных бібліятэк у непарыўнай адукацыі і ў Маніфесце публічных бібліятэк (г. Оейрас), Праект «PULMAN»:

«Сфокусировать свою работу на потребностях детей и всех тех, кто заботиться о них, посредством создания интересной, безопасной и стимулирующей атмосферы для учебной деятельности и досуга, сочетая игры и новые технологии, а также создавая партнерские отношения со школами и другими образовательными учреждениями.

Развивать свою деятельность в качестве центров «открытого» и неформального обучения, предоставляя соответствующие материалы, тренинг и поддержку гражданам на всех этапах их жизнедеятельности, полностью задействуя все преимущества возможностей электронного обучения.

Принимать участие в формировании функционально грамотного информационного общества, поддерживая программы чтения с исполь-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зованием всех средств, включая возможности глобальной сети Интернет» [7].

Замежныя аўтары таксама надаюць увагу адукацыйнай функцыі публічных бібліятэк. Так, С. Сімонс-Рупер падтрымку адукацыі разглядае адначасова як і прапаганду, і заахвочванне, і выкарыстанне фондаў і паслуг публічных бібілятэк, а таксама кіраўніцтва пошукам, адборам і выкарыстаннем адабраных матэрыялаў. У рабоце бібліятэкі ўдзяляецца шмат увагі выпрацоўцы навыкаў чытання і самаадукацыі, навучанню куратараў і настаўнікаў уменню карыстацца бібліятэкай і яе фондамі, прадастаўленню інфармацыі аб навучанні і выхаванні ўсім, хто заняты ў сістэме адукацыі. Гэта сведчыць аб тым, шо адукацыйная функцыя бібліятэкі раскрываецца ў працэсах павелічэння колькасці і якасці ведаў, пашырэнні далягляду асобы чытача, фарміраванні ўменняў і навыкаў самастойнага пошуку інфармацыі, яе перапрапрацоўкі і атрымання ведаў, станаўлення асновы бесперапыннай адукацыі на базе самаадукацыі [5, *12*].

У Законе Расійскай Федэрацыі «О библиотечном деле» бібліятэка разглядаецца і як адукацыйная ўстанова, што дае магчымасці сярод галоўных яе функцый выдзеліць і адукацыйную [10]. Мадэльны бібліятэчны кодэкс для дзяржаў–удзельніц СНД (частка першая) сярод асноўных задач агульнадаступных бібліятэк змяшчае «распространение знаний и информации в обществе, осуществление культурной, научной и просветительной деятельности, направленной на удовлетворение духовных, интеллектуальных и культурных потребностей граждан» [9]. У Маніфесце Расійскай Бібліятэчнай Асацыяцыі (РБА) аб публічнай бібліятэцы запісана сярод асноўных задач, што даныя бібліятэкі «содействуют непрерывному образованию всех уровней и самообразованию» [8]. На аснове задач выдзелены і функцыі, сярод якіх — аказанне сваім карыстальнікам дапамогі ў авалоданні інфармацыйнай культурай і камп’ютарнай граматай.



У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» сярод асноўных прынцыпаў дзейнасці бібліятэк Беларусі выдзяляецца распаўсюджванне гуманістычных ідэй, навуковых і прававых ведаў, дасягненняў сусветнай культуры. Публічная бібліятэка вызначаецца як бібліятэка, якая задавальняе ўніверсальныя інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў бібліятэкі; асабістае задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў бібліятэкі, звязаных з іх адукацыйнай дзейнасцю, вылучана ў бібліятэк устаноў адукацыі (спецыяльных) [1]. На жаль, ні ў вызначэнні публічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі, ні сярод асноўных яе задач і функцый дзейнасць у галіне адукацыі, бесперапыннай адукацыі ў нарматыўных прававых дакументах Рэспублікі Беларусь не знайшла адлюстраванне.

Цесна звязана з адукацыйнай функцыяй асветніцкая. На сучасным этапе ўніверсальныя масавыя бібліятэкі, у асноўным, закліканы абслугоўваць чытачоў, якія маюць не толькі і не столькі прафесійныя інфармацыйныя патрэбнасці, колькі звязаныя з дасугавым чытаннем, самаадукацыяй, а таксама інтарэсамі, якія выходзяць за рамкі чытання і адносяцца непасрэдна да культурна-дасугавай дзейнасці [3, *9*]. Таму, на наш погляд, трэба ўлічваць, што за шматлікімі ўстановамі культуры, у тым ліку і бібліятэкамі, гістарычна была замацавана асветніцкая функцыя, якая на сучасным этапе становіцца «весомее і нужнее» [5, *11*]. Сучасныя аўтары лічаць, што бібліятэка была і застаецца асветніцкай установай, што карэнна адрознівае яе ад іншых арганізацый сістэмы адукацыі. Данае адрозненне заключаецца ў свабодзе накіравання адукацыі і самаадукацыі, у індывідуальным выбары крыніц і сродкаў для павышэння ўзроўню ведаў і культуры [3, *12*]. Н. Е. Дабрыніна адзначае, што аб'ектам асветніцкай функцыі з'яўляецца асоба з яе свабоднымі, нічым не абмежаванымі інтарэсамі. Асветніцкая функцыя ўключае ў сябе адукацыйную функцыю, аднак толькі ў той ступені, у якой бібліятэка садзейнічае навучанню і выхаванню. Па меркаванню Н. В. Жадзько асветніцкая дзейнасць прадстаўляе сутнасную характарыстыку бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, што праяўляецца ў яе адукацыйнай дзейнасці як самастойнай установы. Віды, формы і метады гэтай дзейнасці мяняюцца ў залежнасці ад змены патрэбнасцей розных груп грамадства і патрабаванняў часу. Галоўная задача асветніцкай дзейнасці бібліятэкі — забяспечыць пераемнасць ад школьных ведаў да вузаўскіх, а потым да самаадукацыі. Такім чынам, можна лічыць, што бібліятэка ўключана ў культурна-адукацыйную прастору, у якой яе галоўная мэта — аптымальнае інфармацыйнае забеспячэнне жыццядзейнасці грамадства ў цэлым і кожнага чытача паасобку [5, *11—13*].



На наш погляд, ва ўмовах павелічэння ўвагі да бесперапыннай адукацыі, «адукацыі праз усё жыццё», мэтазгодна разглядаць сацыяльна-адаптацыйную функцыю публічных бібліятэк. Яна прадугледжвае выхаванне чалавека культуры, які здольны змяняць аснову свайго мыслення. Аснову сацыяльна-адаптацыйнага працэсу ў бібліятэцы складае гуманістычная педагогіка, якая адпавядае патрабаванням індывідума ў самастойным пошуку навуковых арыенціраў і сэнсаў, і г.д. Важна, каб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працэс пазнання фарміраваў, максімальна поўна ўлічваў індывідуальныя здольнасці індывідума, цікавасць і патрэбнасць у новых пазнавальных магчымасцях, якія ўзнікаюць на працягу ўсяго жыцця [13, *26*]. Характар і прызначэнне сацыяльна-адаптацыйнай функцыі абумоўліваюцца садзейнічаннем культурнай і сацыяльнай адаптацыі і інтэграцыі самых розных груп, якія складаюць грамадства, забеспячэннем здольнасці членаў грамадства своечасова рэагаваць і ўзаемадзейнічаць ва ўмовах сацыяльнай рэчаіснасці. Пры гэтым сацыяльная адаптацыя разглядаецца і як асэнсаванне чалавекам неабходнасці асабістага росту, імкненне да самарэалізацыі і самаактуалізацыі ў рэальным сацыяльным асяроддзі. Сацыялізацыя разглядаецца як актыўна-пераўтваральная дзейнасць чалавека, пры дапамозе якой адбываецца ўключэнне яго ў жыццё грамадства, фарміраванне сацыяльных сувязей, асваенне ўсеагульных пытанняў практычнай дзейнасці, развіццё свядомасці, самасвядомасці, сістэм сацыяльнай арыентацыі і г.д. Сацыялізацыя па сваёй сутнасці з'яўляецца самарэалізацыяй індывіда ў працэсе яго актыўна-працоўнай дзейнасці [13, *26—27*].

Такім чынам, публічныя бібліятэкі традыцыйна з'яўляюцца непасрэднымі ўдзельнікамі сістэмы бесперапыннай адукацыі.



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь [Электронны рэсурс] : Закон Рэспублікі Беларусь : прыняты 22 сакавіка 1995 г. № 3680-XII : у рэд. ад 01.07.2014, № 173-З. — Рэжым доступу : http://www.pravo.by/main.aspx?guid=3871&p0=v19503680&p2={NRPA}. — Дата доступу : 5.12.2015.

2. Дворкина, М. Я. Библиотечная среда : теория и организация : [науч.-практ. пособие] / М. Я. Дворкина. — М. : Литера, 2009. — 101 с. : ил. ; 20 см. — (Серия «Современная библиотека» ; вып. 62).

3. Жаркова, Л. С. Методика организации работы библиотеки в сфере социально-культурной деятельности : [науч.-практ. пособие] / Л. С. Жаркова. — М. : Литера, 2009. — 110 с. ; 20 см. — (Серия «Современная библиотека» ; вып. 44).

4. Кодекс Республики Беларусь об образовании [Электронный ресурс] : от 13 янв. 2011 г. № 243-З : принят Палатой представителей 2 дек. 2010 г. : одобрен Советом Республики 22 дек. 2010 г. : в ред. от 4 января 2014 г. № 126-З. — Режим доступа : http://www.etalonline.by/Default.aspx?type=text&regnum=Hk1100243#load_text_none_2_2. — Дата доступа : 5.12.2015.

5. Лысикова, Н. П. Современная библиотека и образование : социокультурный аспект : [науч.-практ. пособие] / Н. П. Лысикова, О. И. Алимаева, Н. Р. Вакулич. — М. : Литера, 2009. — 66 с. ; 20 см. — (Серия «Современная библиотека» ; вып. 53).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Манифест ИФЛА / ЮНЕСКО о публичной библиотеке [Электронны рэсурс]. — Режим доступа : http://www.ifap.ru/ofdocs/ifla/ifla09.pdf. — Дата доступа : 5.12.2015.

7. Манифест публичных библиотек (г. Оейрас), Проект «PULMAN», программа «Электронная Европа» [Электронны рэсурс] : принят в 2003 г. — Режим доступа : www.pl.spb.ru/manifest.doc. — Дата доступа : 5.12.2015.

8. Манифест Российской Библиотечной Ассоциации (РБА) о публичной библиотеке [Электронны рэсурс]. — Режим доступа : http://www.rba.ru/or/comitet/14/manifest.html. — Дата доступа : 5.12.2015.

9. Модельный библиотечный кодекс для государств–участников СНГ (часть первая) [Электронны рэсурс]. — Режим доступа : http://www.nbuv.gov.ua/law/01mabmbk.html. — Дата доступа : 5.12.2015.

10. О библиотечном деле [Электронны рэсурс] : федер. закон : Российская Федерация : принят Гос. Думой 23 ноября 1994 года : с изменениями от 08.06.2015 г. № 151-ФЗ. — Режим доступа : http://www.gpntb.ru/win/ruszak/ip/pravo9.htmlhttp://www.gpntb.ru/win/ruszak/ip/pravo9.html. — Дата доступа : 5.12.2015.

11. Рапацевич, Е. С. Педагогика : [свыше 3000 статей] / Е. С. Рапацевич ; под общ. ред. А. П. Астахова. — Минск : Современная школа, 2010. — 719 с. — (Современная энциклопедия).

12. Руководство ИФЛА / ЮНЕСКО по развитию службы публичных библиотек [Электронны рэсурс]. — Режим доступа : http://www.aonb.ru/doc/IFLA/Public.pdf. — Дата доступа : 5.12.2015.

13. Щирикова, Л. Д. Социально-ориентированная проектная деятельность в библиотеке : науч.-практ. пособие / Л. Д. Щирикова, Н. В. Яценко. — М. : Литера, 2010. — 94 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ